*М. М. Забаўскі (Мінск)*

# УРАДАВАЯ МОЎНАЯ ПАЛІТЫКА І КУЛЬТУРНАЯ САМАІДЭНТЫФІКАЦЫЯ НАЦЫЙ У БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ ХХ СТ.

Кожная нацыя як сацыяльная групоўка фарміруецца на аснове пэўнай рэферэнтнай культуры. У Расіі такой была культура і мова рускіх як дамінуючай (у дэмаграфічным аспекце) этнічнай групы. Беларусь у пачатку ХХ ст. уваходзіла ў склад Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў. У паўночных паветах Віленшчыны і на Ковеншчыне большасць насельніцтва складалі літоўцы. Мясцовыя палітыкі цапкам выкарысталі наяўнасць літоўскага арэала. Віленскі край не меў выразных этнічных межаў і разам з Гродзеншчынай стаў зонай дзейнасці краёўцаў (плынь польскага нацыянальнага руху ў Беларусі і Літве ў пачатку ХХ ст.). На астатняй вызначанай тэрыторыі дамінавалі беларусы. Разам з пачаткам беларускай перыёдыкі, кнігадрукавання, тэатра пачынае свой адлік і беларуская культурная традыцыя. Пры гэтым працягвалі існаваць і «ліцвінства» (якое знайшло сваё ідэалагічнае абрамленне ў асноўным у «краёвасці»), і «заходнерусізм» (які стаў ідэалагічнай платформай таварыстваў «Крестьянин» і «Белорусское общество»), якія арыентаваліся на царызм.

Урадавая палітыка ў Беларусі, накіраваная на раскол беларускага этнасу па веравызнанні на «рускіх» і «палякаў», задавальняла польскія нацыяналістычныя групоўкі. На гэтай аснове яна імкнулася заключыць пагадненні з «западнороссами» аб падзеле «сфер уплыву». Далучаныя па выбарчым законе ад 3 чэрвеня 1907 г. да пануючай нацыі (стварэнне нацыянальных курый па нацыянальнасці і ўключэнне праваслаўных беларусаў у лік рускіх) і атрымаўшыя перавагу ў барацьбе з яўрэйскай і польскай буржуазіяй правыя з мясцовых аддзяленняў Саюза рускага народа, Рускага ўскраіннага саюза разам з праваслаўнай часткай вясковай буржуазіі пісалі, што прыйшоў час гаварыць аб тым, што Расія павінна належаць рускім і яны павінны ёю кіраваць: «Жадаеш жыць з Расіяй — падпарадкоўвайся яе законам і ўладзе, не жадаеш — гладкай дарогі».

Рашэнне падтрымліваць урадавы нацыянальны курс і садзейнічаць аб'яднанню «рускіх» сельскіх дзеячаў для культурнай «працы ў духу рускіх пачаткаў у краі» было прынята на форуме «истинно русских» дзеячаў у Вільні ў жніўні 1908 г. Тут жа па прыкладзе сталічных «патрыётаў» былі створаны Рускі нацыянальны саюз з мэтай «аб'ядналь мясцовае рускае насельніцтва ў імкненні зберагчы нацыянальныя набыткі Расіі ў краі: веру, мову і народнасць, умацаваць духоўную і культурную сувязь з карэннай Расіяй».

Шавінізм ва ўнутранай палітыцы ўрада праявіўся і ў дзейнасці Расійскага «дарэвалюцыйнага парламента». У кастрычніку 1910 г. III Дзяржаўная дума прыступіла да разгляду Палажэння аб пачатковых вучылішчах. Выкарыстанне рускай мовы ў школах імперыі, задачы пачатковай адукацыі і становішча царкоўнапрыходскіх школ былі галоўнымі пунктам пры яго абмеркаванні. Прадстаўнікі партый урадавага лагера заяўлялі аб тым, што «мова кіруючага класа павінна быць абавязковай дзяржаўнай мовай». Высокую актыўнасць пры абмеркаванні гэтага пытання праявілі дэпутаты ад беларускіх губерняў: епіскап Мітрафан (Магілёўская губерня) і інспектар народных вучылішч Гродзенскай губерні В. К. Тычынін, якія галасавалі за прапановы ўрада, імкнуліся не дапусціць распаўсюджвання ў заходніх губернях польскай, яўрэйскай і беларускай моў.

«Адзінства рускай дзяржаўнай мовы, выкладанне ва ўсіх урадавых, грамадскіх і прыватных школах выключна на рускай мове» — такой была платформа віленскага Рускага нацыянальнага саюза.

Друкаваны орган «крайне правых сил» газета «Окраины России» пад ідэйным кіраўніцтвам В. Бывалькевіча пераконвала чытачоў у тым, што беларусам свая мова не патрэбна. «Калі б беларусы жылі не ў Расійскай дзяржаве, а ў другой,— пісала яна,— для

захавання сваёй нацыянальнасці беларусам неабходна было б трымацца сваёй, хоць і запаздалай у сваім развіцці, мовы. «...» А калі іншая мова каму і патрэбна, то толькі палякам для таго, каб паланізаваць беларускі народ і аддзяліць яго ад вялікай рускай сям'і».

Дэпутаты ад польскага насельніцтва заходніх губерняў аб'ядналіся ў Думе ў польска-літоўска-беларускае кола. Яго прадстаўнікі прыклалі шмат намаганняў для паляпшэння сітуацыі ў галіне культуры ў краі. Асаблівую ўвагу яны акцэнтавалі на праблеме роднай мовы. Дэпутаты лічылі, што сістэма адукацыі павінна ўлічваць як індывідуальныя, так і этнічныя асаблівасці вучняў. Гучалі прапановы дазволіць выкладанне на роднай мове ў прыватных пачатковых вучылішчах. Актыўна выступалі за змены ў школьнай палітыцы І. Монтвіл (дырэктар Віленскага зямельнага банка) і ксёндз С. Мацэевіч (Віленская губерня). Апошні падкрэсліваў, што існуючая ў заходніх губернях школа не адпавядае патрабаванням грамадства і «не павінна быць зброяй палітычнай прапаганды».

Крытыка афіцыйнай школы з боку польскіх дэпутатаў не знайшла падтрымкі ў думскай большасці. У школе, якая б улічвала этнакультурныя асаблівасці рэгіёна, дэпутаты бачылі пагрозу расійскай дзяржаўнасці.

У маі 1912 г. Дзяржаўная дума прыняла рашэнне, якое дазваляла выкладанне Закона Божага для дзяцей «маларосаў і беларусаў на рускай мове, для літоўцаў — на літоўскай, для палякаў — на польскай». Беларускія нацыянальныя дзеячы лічылі, што на гэты крок вялікарускіх шавіністаў падштурхнула імкненне польскіх нацыянальных дэмакратаў увесці польскую мову выкладання для беларускіх дзяцей. Спроба русіфікацыі ў гэтай галіне толькі ўмацоўвала імкненне да самапаланізацыі.

Па аналагічнай схеме развівалася сітуацыя і з мовай навучання ў пачатковай школе. Газета «Наша ніва» акцэнтавала ўвагу на прамове ў Думе дэпутата С. Мацэевіча, які адстойваў польскую мову навучання для дзяцей беларусаў-католікаў у пачатковай школе і протаіерэя з Мінскай губерні А. Юрашкевіча, які выступаў за рускую мову. Дэпутаты прынялі прапанову апошняга. Дзеячы «Нашай нівы» ўсведамлялі ўсю значнасць вырашэння праблемы заваявання беларускай мовай «месца ў грамадстве». Нацыянальная літаратурная мова магла сфарміравацца пры ўмове атрымання ёю месца ў пачатковай, сярэдняй і вышэйшай школе, у навуковых, грамадскіх установах, царкве і касцёле ў Беларусі. Для дасягнення гэтай мэты вакол «Нашай нівы» гуртавалася свядомая беларуская інтэлігенцыя. Сваёй галоўнай задачай яна лічыла барацьбу за ўсебаковае нацыянальна-культурнае адраджэнне беларусаў, іх роўнасць з іншымі народамі.

Але неабходна падкрэсліць малалікасць нацыянальнай эліты як нацыянальную рысу беларусаў ці антыэлітарызм. Адсюль і антыэлітарызм беларускай свядомасці, культуры і адсутнасць глабальнай нацыянальнай ідэі, якая б вызначала агульнасусветную унікальнасць народа. Ацаніць уласную харызму беларусам «дапамагалі», з аднаго боку, праваднікі ідэй «заходнерусізму» разам з урадам, з другога — краёўцы, якія падкрэслівалі унікальнасць беларуска-польска-літоўскага культурна-палітычнага сінтэзу на аснове каталіцтва і польскамоўнай «высокай» культуры.

## Літаратура


1. Акара А. Тутэйшыя: «Северо-западный край» ці «Kresy Wschodnie»? // Беларускі гістарычны агляд. Мн., 2000. Т. 7. Сш. 1 (12). С. 117—124.
2. Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.) Мн., 1999. С. 71—113.
3. Рудовіч С. Пра месца палякаў у Новай гісторыі Беларусі // Беларускі гістарычны агляд. Мн., 2001. Т. 8. Сш. 1—2 (14—15). С. 230—242.
4. Смалянчук А. Палякі Беларусі і Літвы XIX — пачатку XX ст. як этнакультурны і сацыяльны феномен (гістарыяграфічны агляд) // Беларускі гістарычны агляд. Мн., 2000. Т. 7. Сш. 1 (12). С. 148—178.

5. Наша ніва. 1907. 12 верас., 12 кастр.
6. Наша ніва. 1912. 16 лют.
7. Наша ніва. 1913. 10 студз., 13, 20 лют.

***Ю. Ю. Захарына (Мінск***

## АРХІТЭКТУРНА-МАСТАЦКІ ВОБРАЗ У КУЛЬТУРФІЛАСОФСКІМ КАНТЭКСЦЕ

Праблема мастацкага вобраза заўсёды знаходзілася у цэнтры увагі культурфіласоф скіх вучэнняў, вылучалася як адна з асноўных у мастацтвазнаўстве. У розныя гістарычны перыяды ў разнастайных сферах гуманістыкі існавала ўласнае тлумачэнне катэгорыі мас тацкага вобраза.

Сваю спецыфіку набыла канцэпцыя мастацкага вобраза ў філасофска-эстэтычна думцы. Найбольш раннія філасофска-эстэтычныя вучэнні выводзілі сваё тлумачэнне зых дзячы з пазіцый узаемасувязі прыроды і мастацтва. У перыяд антычнасці асноўным ме каваннем з'явілася думка аб тым, што мастацтва выступае формай перайманне рэчаісн сці [1—2]. Яно адлюстроўвае бачнае і ўзыходзіць да асноў прыроды, таму паміж прырода і мастацтвам істотнай розніцы не існуе [3]. Мастацкі вобраз у канцэнтраванай форме з рае і ўвасабляе ў сваіх творах усё тое, што ў прыродзе па-рознаму выглядае. Прыгажос мастацтва ўяўляе гармонію і суразмернасць [4].

Больш позднія трактоўкі праблемы мастацкага вобраза сцвярджаюць думку аб тым, ш сутнасць мастацтва вядзе да вытокаў рэчаіснасці і ўзнаўляе пачуццёвую карціну свету [ У выніку мастацкі вобраз адлюстроўвае форму грамадскага быцця і грамадскай свяд масці. Мастацтва з'яўляецца мысленнем у вобразах, сузіраннем ісціны, яно заключана развіцці. Мастацкі вобраз адлюстроўвае аб'ектыўны свет, аб'ектывізм выяўляецца ў тып ме [6—8; 9, с. 96].

Мастацкі вобраз з'яўляецца індывідуальнай рэчаіснасцю, якая ўвасабляе праз ся ідэю. Мастацкая ідэя як рэчаіснасць выступае ідэалам, які мае тры формы — сімвалічну класічную і рамантычную. Кожная форма ўвасабляецца ў вобразнай выразнасці пэўнага в ду мастацтва. Для дойлідства характэрна сімвалічная форма мастацтва [10, с. 115—116].

Мастацтва — гэта спецыфічны спосаб пазнання. Мастацкія вобразы выяўляюць на больш істотныя адносіны да свету [11]. Праявы мастацкага вобраза адзначаюцца задоў да таго, пакуль яно набывае прыгажосць [12].

Мастацтва выступае сімвалам душы культуры і выяўляе ў вобразах светаадчуванне ч лавека. Кожная культура фарміруе пры гэтым уласную мастацкую накіраванасць [13].

Пачаткам мастацтва з'яўляецца архітэктура [14]. Яна заўсёды прысвечана адн тэме — імкненню духоўнай энергіі пераадолець коснасць. Дойлідства — найбольш мат рыяльнае і найбольш абстрактнае з усіх мастацтваў. Творы архітэктуры адлюстроўваю дух таго грамадства, якому служаць дойліды [15]. Мастацкі вобраз архітэктуры адлюстр вае сваю эпоху, быт людзей, іх эстэтычныя густы і ўзровень тэхнічнага развіцця [16, с. 2 Мастацкі вобраз дойлідства вызначае сінтэз навуковага і тэхнічнага развіцця і мастац творчасці [17]. Фарміраванне мастацкага вобраза ў архітэктуры здзяйсняецца шляхам сін зу канструкцыйнай і эмацыянальна-выразнай форм. Асноўнымі сродкамі ўтварэння ма тацкага вобраза ў дойлідстве выступаюць арганізацыя прасторы, маштаб і прапорцыі, луэт і кампазіцыя, рытм і тэктоніка, колер і фактура матэрыялаў, суадносіны з прыродны асяроддзем [18].

Існуюць вызначальныя пачаткі ў архітэктуры, якія фарміруюць мастацкі вобра сіметрыя і рытм [19]; успрыманне прасторы зверху ўніз — маштаб, прапорцыі, рытм [2 Асновай фарміравання мастацкага вобраза з'яўляецца перайманне, адпаведнас